# Алімпіядныя заданні для старшакласнікаў: беларуская літаратура

**І. А. Ганчарова,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
СШ № 32 г. Магілёва

На першым этапе падрыхтоўкі да алімпіяды вельмі важна арганізаваць урочную і пазаўрочную дзейнасць такім чынам, каб вучні маглі праявіць свае магчымасці ў розных сферах. У такой сітуацыі не абысціся без дыферэнцыраванага падыходу, форм і метадаў развіцця творчага мыслення.

Заняткі будуюцца наступным чынам:

- тэарэтычная частка;
- практычная адпрацоўка матэрыялу;
- выкананне алімпіядных заданняў;
- работа з творчымі заданнямі па літаратуры;
- выніковая комплексная работа.

Самыя цікавыя літаратурныя заданні прапаную вашай увазе.

**Заданне 1. Падкрэсліце чацвёртае лішняе слова і абгрунтуйце свой выбар.**

А) санет, трыялет, паэма, актава.
Б) эпітэт, метафара, гіпербала, рэфрэн.
В) ямб, амфібрахій, дактыль, анапест.
Г) навела, аповесць, апавяданне, легенда.
Д) рытм, рыфма, маналог, страфа.

**Заданне 2. Знайдзіце лішні элемент у кожным з пералікаў.**

А) “Курган”. Янка Купала. Паўлінка. Гораў. Наталька і Машэка. “Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася Спадчына...”.

Б) Дзядзька-кухар. Якуб Колас. Іван Луцэвіч. “Хмарка”. “Сымон-музыка”. “Новая зямля”.

В) Максім Багдановіч. “Замерзла ноччу шпаркая крыніца...” “Зорка Венера ўзышла над зямлёю...” “Слуцкія паясы”. Кніга паэзіі “Вянок”

**Заданне 3. Вызначце па апісанні літаратуразнаўчы тэрмін.**

1. Лірычны верш, прасякнуты сумным настроем.
2. Разнавіднасць метафары, якая заключаецца ў наданні чалавечых уласцівасцей рэчам, прадметам, з’явам прыроды.

3. Спалучэнне супрацьлеглых разуменняў, якія лагічна выключаюць адно другое, але ўжытыя разам даюць новае паэтычнае ўяўленне.

4. Перанясенне ўласцівасцей адной з’явы на другую, чым-небудзь падобную на яе.

5. Незвычайны парадак слоў у сказе, які дапамагае зразумець ідэю твора і ставарае своеасаблівы настрой.

**Заданне 4. Упарадкуйце пераблытаныя ячэйкі табліцы “Афарызм – аўтар – сэнс – сінанімічная прыказка”. Узор: А-1, Б-4, В-3, Г-2.**

| Афарызм | Аўтар | Сэнс | Прыказка-сінонім |
|---|---|---|---|
| А | Б | В | Г |
| 1. “Вучыся, нябожа, вучэнне паможа” | 1. Якуб Колас | 1. Славы прагне той, хто не здольны набыць яе ўласным розумам | 1. Як дбаеш, так і маеш |
| 2. “Другі баран – ні “бэ”, ні “мя”, а любіць гучнае імя” | 2. М. Багдановіч | 2. Радзіма заўжды застаецца самым любімым месцам на зямлі | 2. Вучыцца заўсёды згадзіцца |
| 3. “Рупная пчала ўмее ў соты мёд сабраць і з горкіх кветак” | 3. Кандрат Крапіва | 3. Набывай веды – і станеш сапраўдным чалавекам | 3. Няма лепш за той куток, дзе вязалі пупок |
| 4. “Мой родны кут, як ты мне мілы …” | 4. Янка Купала | 4. Дбайны чалавек дасягае поспеху ў працы, нават пры неспрыяльных умовах | 4. Колас, што зярнят не мае, угару лоб задзірае |

**Заданне 5. Па апісанні свята прыгадайце яго назву.**

1. У гэты дзень дзяўчаты звычайна пякуць з цеста своеасаблівыя піражкі, якія называюць “галёпы”.

У гэты дзень выганяюць зіму на цэлы год: робяць са снегу бабу, потым разбіваюць яе на часткі.

2. Найвялікшае каляндарнае свята, якое складае выключную адметнасць, самабытнасць беларускага абрадава-святочнага календара. У старажытных славян першапачаткова так называлася веснавое свята ў гонар сонца, абуджэння прыроды і надыходу “вялікіх дзён” палявых работ. Адсюль і назва.

3. Напярэдадні гэтага свята беларусы ўшаноўвалі сімвал парадку, вясны, росквіту прыроды. Дзяўчаты на лузе выбіралі самую прыгожую дзяўчыну, апраналі яе русалкай, упрыгожвалі зеленню, вянком з кветак, вадзілі вакол яе карагоды і спявалі

4. Лічылася, што ў гэты час каляндарная вяршыня росквіту прыроды, бо ўжо хутка “прыйдзе Пятрок – ападзе лісток”. У народзе верылі, што ў гэту ноч рэкі свецяцца асаблівым нерэальным святлом, а ў іх водах купаюцца душы памерлых у абліччы русалак.

**Заданне 6. Устанавіце адпаведнасць паміж афарызмамі і іх аўтарамі.**

А) Каханне і веру не трэба ўсім выстаўляць напаказ:душа толькі чуе і неба.

Б) Не шукай ты шчасця, долі на чужым далёкім полі.

В) Край наш – дзівосны прыстанак загадак і цудаў.

Г) Што мне Вена, Мадрыд, што мне Лондан туманны, больш за ўсё я бацькоўскаму краю адданы.

Д) Не народ для ўрада, а ўрад для народа.

1. Р. Барадулін. 2. М. Гусоўскі. 3. Янка Купала. 4. В. Дунін-Марцінкевіч. 5. К. Каліноўскі.

**Заданне 7. Прыгадайце першыя радкі ўказаных твораў. Запішыце іх.**

1. Якуб Колас. Новая зямля. *Мой…*
2. А. Куляшоў. Мая Бесядзь. *Кажуць…*
3. Максім Танк. Родная мова. *З легендаў…*
4. П. Панчанка. Герой. *Злосна...*
5. Кандрат Крапіва. Ганарысты парсюк. *Бывае…*
6. Янка Купала. Явар і каліна. *Песняй…*
7. М. Багдановіч. Трыялет. *Калісь..*

**Заданне 8. Суаднясіце імёны пісьменнікаў і назвы іх зборнікаў.**

| | |
|---|---|
| 1. Ф. Багушэвіч | А) Вянок |
| 2. Янка Купала | Б) Матчын дар |
| 3. М. Багдановіч | В) Рунь |
| 4. М. Гарэцкі | Г) Жыта, сосны й валуны |
| 5. А. Гарун | Д) Жалейка |
| 6. Н. Гілевіч | Е) Песні жальбы |
| 7. П. Панчанка | Ж) Дудка беларуская |
| 8. Якуб Колас | З) І вера, і вернасць, і вечнасць |

**Заданне 9. Суаднясіце паняцці (напрыклад: 1АIII; 2БV).**

| | | |
|---|---|---|
| 1. В. Быкаў | А) Літоўскі хутарок | I. Вайна ў Афганістане |
| 2. У. Караткевіч | Б) Жураўліны крык | III. Першая сусветная |

| | | |
|---|---|---|
| | | вайна |
| 3. І. Мележ | В) Каласы пад сярпом тваім | IV. Паўстанне Кастуся Каліноўскага |
| 4. М. Гарэцкі | Г) Сірочы хлеб | V. Вялікая Айчынная вайна |
| 5. Янка Брыль | Д) Людзі на балоце | VI. Заходняя Беларусь у складзе Польшчы |
| 6. С. Алексіевіч | Е) Цынкавыя хлопчыкі | VII. Час калектывізацыі |

**Заданне 10. Адкажыце на пытанні.**

1. Якая жанравая форма адпавядае зместу верша А. Куляшова "Бывай..."?

2. Да якой Коласавай літаратурнай казкі эпіграфам узяты словы Янкі Купалы «Не шукай ты шчасця, долі / На чужым далёкім полі»?

3. У прадмову да якой кнігі ўвайшлі вядомыя словы Ф. Скарыны: "Понеже от прироження звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя; птицы, летающие по возъдуху, ведають гнезда своя... тако же и люди, игде зродилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имають"?

4. Да якой байкі Кандрата Крапівы падыходзіць наступная прыказка "Гонару стос, а разуму – з камарыны нос"?

**Заданне 11. Па апісанні пазнайце літаратурны псеўданім пісьменніка, назавіце сапраўднае імя.**

А) У маладосці пісьменнік закахаўся ў Ядвігу Шабуневіч з Радашковічаў. Нягледзячы на расстанне, былая каханая назаўсёды засталася ў сэрцы аўтара, а яе імя і прозвішча далі жыццё псеўданіму.

Б) Пісьменнік тлумачыў абраны псеўданім вершам, першыя радкі якога ў пачатковым варыянце гучалі наступным чынам:

Не цягнусь я за Чаротам
І Купале не раўня,
А жыву сабе пад плотам
Ціха дзень тут ада дня.

В) Выбар псеўданіма гэтым пісьменнікам звязаны з датай нараджэння, якая выпадае на народнае свята.

Г) Свет "раслінных" псеўданімаў быў ужо, што называецца, разабраны: Колас, Чарот, Пушча, Васілёк… Мне нічога не заставалася, як пашукаць што-небудзь "жалезнае", вось я і спыніўся на …

**Заданне 12. Журналісты часта перайначваюць вядомыя радкі літаратурных твораў. Устанавіце, як выглядалі паэтычныя радкі ў арыгінале. Назавіце іх аўтараў.**

1. Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба паглядзець на яе вачамі іншаземца ("Звязда").

2. Трэба ў лазню хадзіць часцей ("Народная газета").

3. Кажуць, вёска мая вымірае… ("Чырвоная зорка").

**Заданне 13. Перад вамі *цэнтон* – верш, складзены з урыўкаў розных твораў аднаго ці некалькіх паэтаў. Запішыце імёны і прозвішчы аўтараў асобных радкоў і назвы твораў, адкуль яны ўзятыя.**

Песняй вясны лебядзінаю,
Скінуўшы зімнія чары,
Шэпчуцца явар з калінаю
Ў сумнай даліне над ярам.
Але расстацца нам час наступае;
Пэўна, ўжо доля такая у нас.
Моцна кахаў я цябе, дарагая,
Але расстацца нам час.
Клятву забыў ты, забыў і параду,
Помніш, казала я — мілы,
Ведай жа, кара чакае за здраду
Нават у змроку магілы.

**Заданне 14. Выпраўце памылкі, якія зрабіў у назвах твораў школьнай праграмы нядбайны вучань.**

Кузьма Чорны. Пагоня за шчасцем.
Максім Багдановіч. Слуцкія майстрыцы.
Аляксей Дудараў. Мульцік
Уладзімір Караткевіч. Навальніца на Дняпры.
Янка Купала. Раскіданае гумно
Кандрат Крапіва. Недавучаны Баран.

**Заданне 15. Узнавіце ў прапанаваных урыўках вершаваных твораў жаночае імя. Укажыце аўтара.**

1. Пайшла, ніколі ўжо не вернешся …
Бывай, смуглявая, каханая, бывай.
2. … чарнаброва, галубка мая,
Дзе ж падзелася шчасце і ясна доля твая
2. Я ў сад пайшоў. Ўсё глуха, дзіка,
Усё травою зарасло.
Няма таго, што раньш было.
І толькі надпіс …
4. Мне не забыцца песні той даўняе вясны:
На Мурамскай дарожцы стаялі тры сасны.
Хадзілі мы, спявалі, і з песняй ты цвіла.
… , помніш, якою ты была?

**Заданне 16. Ніжэй прыводзіцца арыгінальны тэкст класічнай рускай літаратуры і яго пераклад на беларускую мову. У асобных радках перакладу зробленыя пропускі. Пастарайцеся ўзнавіць версію**

**перакладчыка і/або прапанаваць уласную. Пры стварэнні ўласнага варыянта (варыянтаў) дазваляецца поўнасцю змяняць радок, у якім ёсць пропуск, галоўнае – захаваць мастацкую цэласнасць твора.**

Унылая пора! Очей очарованье!
Приятна мне твоя прощальная краса –
Люблю я пышное природы увяданье,
В багрец и золото одетые леса,
В их сенях ветра шум и свежее дыханье,
И мглой волнистою покрыты небеса,
И редкий солнца луч, и первые морозы,
И отдаленные седой зимы угрозы.

А. С. Пушкін. Восень.

… пара! Вачэй замілаванне!
Прыемны сэрцу бляск … красы –
Люблю прыроды я ўрачыстае згасанне,
У чырвань з золатам прыбраныя лясы,
Ў іх засені вятроў шумлівых парыванне,
І сонца рэдкае, і зранку маразы,
І тонкаю смугой акрытыя нябёсы,
І … сівой зімы пагрозы.

Пераклад А. Куляшова

**Заданне 17. Замест пропускаў запішыце імёны беларускіх пісьменнікаў**

| Імя | Прозвішча | Імя | Прозвішча |
|---|---|---|---|
| | Багдановіч | | Янішчыц |
| | Гілевіч | | Пашкевіч |
| | Дудараў | | Шамякін |
| | Барадулін | | Быкаў |
| | Дубоўка | | Атраховіч |

**Заданне 18.** Каму з пералічаных герояў п'есы Янкі Купалы "Паўлінка" належаць наступныя словы? Суаднясіце прыведзеныя выказванні з персанажамі. Адказ запішыце ў форме спалучэння "лічба-літара" (напрыклад, 6-е).

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Бацькі спачатку пазлуюць, пазлуюць трохі і адпусцяцца, – ведама, бацькаўскае сэрца. | |
| 2. | Выбачайце, выбачайце, каханенькія, родненькія, адно не скажыце, што ўсяго было ўдаволь, тонькі прынукі не было. | |
| 3. | Собственно, ці свінні елі, ці шляхта папасавалася – гэтак, вось-цо-да, стол выглядае, пане дабрудзею. | |

| | | |
|---|---|---|
| 4. | Э-э! Я думала, хто там!.. Ажно нічога людскога. Толькі ездзіць ды нюхае, якая дзяўчына пасагу больш мае, а сам дык голы, як бізун. | |
| 5. | Але, але! Калісь былі ўсе мужыкі, ну дык цяпер кожны чалавек мужыцкага роду, хоць каторы і прыкідваецца панам ці графам. Ды і што гаварыць! Адам і Ева і то былі мужыкамі. | |
| 6. | Ціха, мае дзеткі, ціха. Не гаруй, не маркоцься, міленькая, вельмі. Неяк жа ды будзе. Бог найвышэйшы, тудэма-сюдэма, міласэрны, і аб тваёй тут цяжанькай долі не забудзецца. | |
| 7. | Хэ-хэ-хэ! Я да ўсякай патраплю падлізацца. | |

А. Агата. Б. Адольф. В. Сцяпан. Г. Пранцісь. Д. Паўлінка. Е. Якім. Ж. Альжбета.

**Заданне 19. Адзначце, якія кнігі ў старажытнасці называліся “книги ратушные”.**

1. Зборнікі юрыдычных дакументаў.
2. Метрычныя кнігі.
3. Кнігі запісаў, звязаных з гарадскім самакіраваннем.
4. Зборнікі дакументаў аб уладанні маёмасцю.
5. Судовыя кнігі, у якія ўносіліся звесткі пра крадзяжы.

**Заданне 20. Адгадайце загадкі.**

| | Слова | | Загадка |
|---|---|---|---|
| А | Граблі | 1 | Прытуліўшыся да сцяны вазоўні, яны спяць і вясною, і летам, і восенню і сняць тую пару, калі ўсё наваколле засцелецца снегам, калі настане “санчас” (А. Разанаў). |
| Б | Лейцы | 2 | Яна адначасова сталёвая і драўляная, кароткая і доўгая, крывая і простая, вострая і тупая, яскравая і цьмяная… (А. Разанаў). |
| В | Сякера | 3 | Яны не грэбуюць ніякай работай: тое, што расцярушылася, яны зганяюць у кучу, тое, што збыталася ў закарузлыя звязы, “разрабоўваюць на камякі, а тое, што блізка, падсоўваюць яшчэ бліжэй (А. Разанаў). |
| Г | Сані | 4 | Яны, “прыклейваючыся” сваімі канцамі да аброці, ліюцца адной ляйчынай у другую, а па іх, у сваю чаргу, ліецца “лекцыя” якую фурман чытае каню (А. Разанаў). |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Д | Кажух | 5 | Яно шчыруе ад цямна да цямна, а калі запальваецца лучына, то і ў часы вялікіх і мігатлівых ценяў, і такім чынам расце: набывае ўсё большую вагу, таўшчыню і вартасць (А. Разанаў). |
| Е | Верацяно | 6 | Ён скажоны: зверху – гладкі, знутры – кашлаты, зверху – бедны, знутры – заможны, зверху – “кожа”, знутры – кужаль (А. Разанаў). |

**Заданне 21. Адкажыце на пытанні да паэмы “Новая зямля”.**

| Пытанні | Адказы |
|---|---|
| 1. Адзін з раздзелаў паэмы называецца “Леснікова пасада”. Што такое *пасада*? | |
| 2. Коласаў выраз *Не сабака страшан воўку, а непрыемна яго звяга* стаў крылатым. Што такое *звяга?* | |
| 3. На новым месцы ў Міхала была *валока зямлі.* Многа гэта ці мала? Прыблізна колькі? | |
| 4. У адным з раздзелаў паэмы чытаем: *“Праз год вясною згарэла хата з варыўнёю”.* Што такое *варыўня?* | |
| 5. Якуб Колас піша, што *“Кастусь у час пажару звалок гарошыны з пасцелі”*. Чаму гарошыны былі на ложку? | |
| 6. Выслоўе А. С. Грыбаедава *Поспорят, пошумят и разойдутся* ўжываецца тады, калі нехта хоча сказаць пра безвыніковасць спрэчак, абмеркаванняў, сходаў. Якое Коласава выслоўе варта ўспомніць у падобных сітуацыях? | |

## Адказы

**Заданне 1.** Падкрэсліце чацвёртае лішняе слова і абгрунтуйце свой выбар.

А) паэма – вялікі вершаваны, часцей сюжэтны твор, астатнія класічныя формы верша.

Б) рэфрэн – слова, радок ці некалькі радкоў, якія паўтараюцца пасля кожнай страфы верша, астатнія – мастацкія тропы.

В) ямб – двухскладовая стапа сярод трохскладовых.

Г) легенда – фальклорны жанр сярод літаратурных.

Д) маналог – форма маўлення, астатнія – адзнакі (прыкметы) верша.

**Заданне 2**. 1. Гораў 2. Іван Луцэвіч 3. ”Слуцкія паясы”.

**Заданне 3.** 1. Элегія. 2. Увасабленне (персаніфікацыя). 3. Аксюмаран (аксімаран). 4. Метафара. 5. Інверсія.

**Заданне 4.** А1Б4В3Г2; А2Б3В1Г4; А3Б2В4Г1; А4Б1В2Г3.

**Заданне 5.** Саракі, Вялікдзень, Юр’е, Купалле.

**Заданне 6.** а1, б3, в2, г4, д5.

**Заданне 7.**

1. Мой родны кут, як ты мне мілы.
2. Кажуць, што рэкі птушкамі створаны.
3. З легендаў і казак былых пакаленняў.
4. Злосна сказаў: "Уставай,пяхота!"
5. Бывае, праўда вочы коле.
6. Песняй вясны лебядзінаю, скінуўшы зімнія чары.
7. Калісь глядзеў на сонца я, мне сонца асляпіла вочы.

**Заданне 8 .** 1ж, 2д, 3а, 4в, 5б, 6г, 7з, 8е.

**Заданне 9.** 1БV; 2Г IV; 3ЕVII; 4АII; 5ВIII; 6ДVI; 7ЖI.

**Заданне 10.** 1. Элегія. 2."Хмарка". 3."Юдзіф". 4. "Ганарысты Парсюк".

**Заданне 11.**

а) Ядвігін Ш. – Антон Іванавіч Лявіцкі;
б) Кандрат Крапіва – Кандрат Кандратавіч Атраховіч;
в) Янка Купала – Іван Дамінікавіч Луцэвіч;
г) Максім Танк – Яўген Іванавіч Скурко.

**Заданне 12.**

1. Каб любіць Беларусь нашу мілую,трэба ў розных краях пабываць (Алесь Ставер).
2. Трэба дома бываць часцей, трэба дома бываць не госцем (Рыгор Барадулін).
3. Кажуць, мова мая аджывае век свой ціхі: ёй знікнуць пара (Пімен Пачанка).

**Заданне 13**

1. Янка Купала "Явар і каліна".
2. М. Багдановіч "Зорка Венера".
3. А. Міцкевіч " Свіцязянка".

**Заданне 14.**

1. Кузьма Чорны – "Пошукі будучыні".
2. Максім Багдановіч – "Слуцкія ткачыхі".
3. Аляксей Дудараў – "Вечар".
4. Уладзімір Караткевіч "Паром на бурнай рацэ".
5. Янка Купала – "Раскіданае гняздо".
6. Кандрат Крапіва – "Дыпламаваны Баран".

**Заданне 15.**

1. Алеся ( А. Куляшоў "Алеся").
2. Марыська ( К. Каліноўскі " Марыська чарнаброва, галубка мая").
3. Вераніка (М. Багдановіч " Ізноў пабачыў я сялібы").
4. Александрына (П. Броўка "Александрына").

**Заданне 16.**

**Маркотная** пара! вачэй замілаванне!
Прыемны сэрцу бляск **знікаючай** красы —
Люблю прыроды я ўрачыстае згасанне,
У чырвань з золатам убраныя лясы,
Ў іх засені вятроў шумлівых парыванне,

І сонца рэдкае, і з ранку маразы,
І тонкаю смугой пакрытыя нябёсы,
І **ледзь прыкметныя** сівой зімы пагрозы.

**Заданне 17. Замест пропускаў запішыце імёны беларускіх пісьменнікаў.**

| Імя | Прозвішча | Імя | Прозвішча |
|---|---|---|---|
| Максім | Багдановіч | Яўгенія | Янішчыц |
| Ніл | Гілевіч | Алаіза | Пашкевіч |
| Аляксей | Дудараў | Іван | Шамякін |
| Рыгор | Барадулін | Васіль | Быкаў |
| Уладзімір | Дубоўка | Кандрат | Атраховіч |

**Заданне 18.** 1е, 2в, 3г, 4ж, 5д, 6а, 7.
**Заданне 19.** 3 – кнігі запісаў, звязаных з гарадскім самакіраваннем.
**Заданне 20.** А3; Б4; В2; Г1; Д6; Е5.
**Заданне 21.**

| | |
|---|---|
| 1. | *Пасада* – сядзіба. |
| 2. | *Звяга* – надакучлівы брэх. |
| 3. | Зямлі было многа, бо *валока* – больш за 21 гектар. |
| 4. | *Варыўня* – невялікі будынак каля хаты для захоўвання гародніны, розных рэчаў. |
| 5. | *Гарошыны* – гарохавая салома, на ёй спалі. |
| 6. | *Забілі зайца не забілі, але ж, брат, гуку нарабілі.* |

## Літаратура


1. Беларуская літаратура: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульн. сярэдн. адукацыі з бел. і руск. мовамі навуч. / В. У. Праскаловіч, В. П. Рагойша. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2019.
2. Беларуская літаратура: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / З. П. Мельнікава. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2021.
3. Беларуская літаратура: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / А. П. Бязлепкіна-Чарнякевіч, А. А. Акушэвіч. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020.
4. Хандрыка, С. В. Беларуская народная культура на ўроках роднай мовы. 5-9 класы: кніга для настаўнікаў устаноў, якія забяспечв. атрыманне агульнай сярэдняй адук., з 12-гадовым тэрмінам навуч. / С. В. Хандрыка. – 2-е выд. – Мазыр: Белы Вецер, 2007. – 90 с.
5. Шкраба, І. Р. Лінгвістычныя задачы па беларускай мове: рыхтуемся да алімпіяды і цэнтраліз. тэсціравання / І. Р. Шкраба. – 2-е выд., выпр. – Мінск: ТетраСистемс, 2011. –112 с.

6. Ліцвінка, В. Д. Святы і абрады беларусаў. – Мінск.: Беларусь,1997. – 176 с.
7. Струкава, С. М. Слоўнік архаізмаў і гістарызмаў: па творах беларускай мастацкай літаратуры і публіцыстыкі. – Мінск: Беларуская навука, 2007. – 654 с.
8. Яначкіна, Г. С. Зборнік алімпіядных заданняў па беларукай мове і літаратуры / Г. С. Яначкіна. – Мінск: ТетраСистемс, 2002. – 89 с.
9. Колас, Я. Новая зямля / Якуб Колас. – Мінск: Беларусь, 2018. – 319 с.
10. Малажай, Г. М. Пазакласная праца па беларускай мове: вучэбны дапам. / Г. М. Малажай, С. Р. Рачэўскі. – Мінск: Выш. школа, 1990. – 254 с.
11. Зборнік заданняў III этапу рэспубліканскай алімпіяды школьнікаў па беларускай мове і літаратуры. Комплексная работа. 9-11 класы. 2006–2010 гады / склад.: Л. П. Лазарчык. – Магілёў: МДАІРА, 2011. – 73 с.
12. Доўгаль, Д. А.125 крокаў да поспеху: зборнік заданняў для падрыхтоўкі да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры: дапам. для настаўнікаў устаноў адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання / Д. А. Доўгаль. – 2-е выд. Мазыр: Выснова, 2021. – 124с.
13. Лясун, Л. І. Беларуская літаратура другой паловы XX стагоддзя // Беларуская мова і літаратура. – 2003. – №5. – С. 27–28.
14. Дзіско, У. Лінгвістычныя заданні / У. Дзіско // Роднае слова. – 2007. – № 1. – С. 64–67.